ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (765) ● Пятніца, 6 сакавіка 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

# СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ ЖАНЧЫНЫ!

## ПАШАНА І ГОНАР ПА ПРАВУ

Міжнародны жаночы дзень — дзень салідарнасці працаўніц усіх кантынентаў у барацьбе за раўнапраўе і свабоду, за мір і нацыянальную незалежнасць народаў, за дэмакратыю і сацыялізм —адзначаецца сёлета ў шасцідзесяты раз, напярэдадні вялікай даты — 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Становішча, якое займаюць у нашай краіне жанчыны на вытворчасці і ў грамадскім жыцці, ва ўсіх галінах навукі і культуры,—вынік здзяйснення вялікіх ленінскіх ідэй пераўтварэння грамадства. Барацьбу за разняволенне жанчын У. І. Ленін, Камуністычная партыя заўсёды разглядалі як частку агульнапралетарскай справы. Ужо ў першыя месяцы Савецкай улады былі прыняты дэкрэты устанаўлення роўнасці праў жанчын і мужчын. У. І. Ленін у артыкуле «Да міжнароднага дня работніц», апублікаваным 50 год назад 8 сакавіка 1920 г., указваў на вялікія заваёвы Савецкай Рэспублікі, якая «адразу змяла ўсе без выключэння заканадаўчыя сляды няроўнасці жанчыны, адразу забяспечыла ёй поўную роўнасць па закону». Барацьба за раўнапраўе жанчын была цесна звязана з далучэннем іх да ўдзелу ў грамадскім жыцці.

Савецкія жанчыны на роўных правах з мужчынамі ўдзельнічаюць у стварэнні матэрыяльных і духоўных багаццяў.

У гады першых пяцігодак у народнай гаспадарцы краіны працавала 35 млн. жанчын. Разам з усім народам яны мацавалі нашу краіну.

А калі над нашай Айчынай навіслі чорныя хмары вайны, савецкія жанчыны ў адным страі з мужчынамі змагаліся за свабоду і незалежнасць Радзімы, праяўляючы пры гэтым незвычайныя мужнасць і гераізм. Жанчыны былі снайперамі і лётчыкамі, кулямётчыкамі і палітработнікамі. Толькі ў партызанскіх атрадах Беларусі змагаліся з ворагам 50 тыс. жанчын. А колькі вытрымкі, вынослівасці і умення пераадольваць любыя цяжкасці праявілі савецкія жанчыны ў тыле!

Як толькі заціхлі апошнія залпы вайны, жанчыны з падвоенай энергіяй уключыліся ў напружаны рытм жыцця краіны. Яны аднаўлялі разбураныя гарады і сёлы, фабрыкі і заводы, саўгасы і калгасы. І вось што знамянальна. У народнай гаспадарцы краіны разам з павышэннем удзельнай вагі жаночай працы адбываецца перамяшчэнне яе ў больш вытворчыя і важныя галіны. На сто работнікаў, занятых у прамысловасці, у краіне прыпадае цяпер 47 жанчын, у будаўніцтве—28, на транспарце — 24, у ахове здароўя—85, у асвеце—72. Сярод спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй 58 працэнтаў складаюць жанчыны. Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што нароўні з мужчынамі жанчыны ўдзельнічаюць у важнай рабоце па стварэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма.

Ва універсітэце працуе 1268 жанчын. Сярод іх чатыры дактары і 102 кандыдаты навук, больш 400 жанчын заняты непасрэдна выкладчыцкай працай. Толькі ў адміністрацыйна - гаспадарчай частцы з агульнай колькасці 632 чалавекі 416—жанчыны. Добрымі працоўнымі справамі сустракаюць яны сваё свята 8 Сакавіка. Нельга не адзначыць шчырую працавітасць каменданта інтэрната № 1 камуністкі Н. С. Галінай, якая сваёй клапатлівай працай здабыла павагу сярод студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Радыёфізічны корпус, камендантам якога з'яўляецца А. М. Ляліна, займае першае месца па падтрыманню чысціні і парадку сярод вучэбных карпусоў БДУ.

Добрасумленна працуюць на сваіх участках каменданты А. В. Пяркоўская, В. Н. Піцерава, О. С. Клімовіч, В. М. Бурмакіна, прыбіральшчыцы А. Д. Наумава, В. С. Граеўская, А. І. Парфімовіч, А. П. Касіловіч, Г. С. Мірошнікава, З. Г. Адамская, В. Я. Сямёнчыкава, Е. Ф. Букіна, Г. С. Богіна, М. Б. Гурская, М. А. Толсцік, М. А. Ульчык, кастэляншы Д. А. Бараноўская, Е. Е. Мазанік, С. А. Сіненок, гардэробшчыцы Н. М. Зелянкова, Е. І. Кулікоўская, К. І. Бутыгіна, О. Н. Гунько і многія, многія іншыя.

А якія цудоўныя водгукі аб рабоце нашай бібліятэкі, якой кіруе Р. Г. Любіна. Вось адзін з запісаў у кнізе водгукаў, які пакінулі прадстаўнікі Міністэрства культуры СССР: «Сардэчна дзякуем калектыву бібліятэкі універсітэта за цудоўную пастаноўку абслугоўвання кнігай студэнтаў і выкладчыкаў.

Мы знайшлі ў бібліятэцы многа цудоўнага і пераканаліся ў тым, што супрацоўнікі бібліятэкі і яе дырэктар сапраўдныя энтузіясты».

Сустракаючы сваё свята, савецкія жанчыны яшчэ цясней згуртоўваюцца вакол ленінскай партыі. Разам з усім народам яны нясуць ударную вахту ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, уносяць дастойны ўклад у будаўніцтва камунізма.

І. АЖЫГІН,
прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы.




*Малюнак студэнта журфака В. ДРАНЧУКА.*

## ЗНАМЯНУЮЧЫ ЮБІЛЕЙ ЛЕНІНА

Гэтымі днямі адбылася справаздачна - выбарная канферэнцыя таварыства «Веды» БДУ. З дакладам аб двухгадовай дзейнасці калектыву прапагандыстаў выступіў старшыня праўлення дацэнт М. Я. Рэзнікаў. Ён адзначыў, што за гэты час члены таварыства «Веды» прачыталі каля 5 тысяч лекцый, было арганізавана 20 калектыўных выездаў лектараў з гутаркамі і лекцыямі на прамысловыя прадпрыемствы, у калгасы і саўгасы рэспублікі. Праведзена 16 навукова-тэарэтычных канферэнцый, прысвечаных жыццю і дзейнасці У. І. Леніна.

Вялікую прапагандысцкую работу сярод насельніцтва вядуць кафедры грамадскіх навук, педагогікі, а таксама факультэцкія калектывы.

Цяпер члены таварыства выступаюць з гутаркамі і лекцыямі па Тэзісах ЦК КПСС «Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» на прамысловых прадпрыемствах Кастрычніцкага раёна: на заводах «Транзістар», «Калібр», імя Мяснікова, аўтазаводзе, маторным і іншых.

На працягу сакавіка будуць праведзены чатыры навукова-тэарэтычныя канферэнцыі. У Барысаў з гэтай мэтай выязджае калектыў кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, а кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў правядзе дзень лектара на радыёзаводзе імя Леніна.

Удзельнікі канферэнцыі выбралі новае праўленне таварыства і яго прэзідыум. Старшынёй праўлення зноў выбран кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Мацвей Якаўлевіч Рэзнікаў.

## УНІВЕРСІТЭТУ — ГАНАРОВАЯ ГРАМАТА КАЗАХСКАЙ ССР

*На працягу многіх год студэнты нашага універсітэта выязджаюць на будоўлі Казахстана. Сваімі умелымі працавітымі рукамі яны ўзводзяць школы, клубы, бальніцы, дзіцячыя сады і яслі, жылыя дамы і жывёлагадоўчыя памяшканні. І вось нядаўна за заслугі ў фарміраванні і арганізацыі работы студэнцкіх будаўнічых атрадаў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Казахскай ССР узнагародзіў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна Ганаровай граматай. Гэтую грамату рэктару нашага універсітэта прафесару А. Н. Сеўчанку ўручыў ва ўрачыстай абстаноўцы прадстаўнік Прэзідыума Вярхоўнага Савета Казахскай ССР А. І. Быстроў. Ад імя усіх прысутных і студэнтаў рэктар падзякаваў за высокую ўзнагароду і запэўніў, што члены будаўнічых атрадаў будуць яшчэ з большым энтузіязмам працаваць у братняй рэспубліцы.*



*Многім замежным студэнтам дапамагае авалодаць рускай мовай выкладчык падрыхтоўчага факультэта Лідзія Андрэеўна Міцкевіч.*

*НА ЗДЫМКУ: Л. А. МІЦКЕВІЧ вядзе заняткі са сваімі выхаванцамі з В'етнама.*

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.



# ДАСТОЙНАЯ СТУПЕНІ ДОКТАР

Абарона дысертацыі — заусёды хвалюючая і урачыстая падзея, а тым больш, калі яна адбываецца напярэдадні вялікага вясновага свята, ды калі дысертант — жанчына, а прадстауленая работа заслугоувае прысуджэння яе аутару ступені доктара навук. На тэты раз імянінніцай была дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін геолага-геаграфічнага факультэта Вольга Піліпауна Якушка. Вядомы у рэспубліцы даследчык азёр, Вольга Піліпауна на працягу 30 год працы ва універсітэце умела спалучае навуковую і педагагічную дзейнасць. Яна перадала свае глыбонія веды не аднаму пакаленню студэнтау, пасеяла у іх душах неадольную цягу да пазнання роднай прыроды, выхавала цэлую пляяду вучняу і паслядоунікау.

І вось перад вучоным саветам гэты прывабны чалавек, нястомны падарожнік і любімы студэнтамі педагог абараняе свае палажэнін, меркаванні, свае погляды, вынікі, рэкамендацыі — плён шматгадовай працы. І вучоны савет аднадушна дае высокую ацэнку дысертацыі В. П. Якушка «Гісторыя развіцця і сучаснае становішча азер поуначы Беларусі».

Звернемся тольні да водгукау афіцыйных апанентау. Доктар геаграфічных навук, прафесар М. І. Нейштадт адзначае галоуныя асаблівасці працы: вялікую колькасць living рознабаковага матэрыялу, комплекснасць у падыходзе да вывучэння азёр, вялікую практычную каштоунасць.

Доктар геаграфічных навук, прафесар Л. Л. Расаліма гаворыць, што праца В. П. Якушка з'яуляецца «першым па глыбіні і шырыні ахопу даследаваннем азёр Беларусі і кладзе моцны фундамент для далейшых прац у гэтым напрамку. Ужо цяпер яна стварае аснову для мэтазгоднага выкарыстання азёрнага фонду рэспублікі».

Акадэмік АН БССР Г. І. Гарэцкі назвау дысертацыю арыгінальным, выдатна дакументаваным, мэтанакіраваным даследаваннем.

Пра аутара сказана коратка: дастойна прысваення вучонай ступені доктара геаграфічных навук.

Мы рады павіншаваць Вольгу Піліпауну ад імя універсітэцкага калектыву з вялікай навуковай перамогай.

# ЧАЛАВЕК ДОБРАЙ ДУШЫ

Паэты называюць дабрату самым светлым талентам. Не ведаю, як наконт таленту, але што гэта самая лепшая рыса характару — упэунены.

Мне хочацца расказаць пра чалавека надзвычай добрага, чулага— Ніну Паулауну Пратасевіч.

Ніна Паулауна ужо нямала гадоу загадвае аддзелам аспірантуры нашага універсітэта. Не адзін кандыдат, ды і доктар навук можа сягоння прыгадаць колішнюю першую сустрэчу з гэтай высокай, стройнай жанчынай — незабыуны момант падачы заявы аб прыёме у аспірантуру. Прыгадваецца гэты момант і мне. Прыгадваюцца і іншыя сустрэчы па пытаннях вучобы і працы. І з усіх іх я вынес пачуццё самай глыбокай павагі да гэтага чалавека, самай шчырай удзячнасці яму. Ніколі я не чуу, каб Ніна Паулауна павысіла тон пры размове з наведвальнікам, паказала сваю нецярпімасць да яго, абарвала размову, пакарысталася службовым становішчам.

З Нінай Паулаунай заусёды прыемна пагаварыць. Яна да кожнага ставіцца з належным разуменнем, даверам, гутарыць шчыра і ветліва, я сказау бы нават—ласкава. Ці не гэта самыя патрэбныя рысы кожнага службовага работніка?!

Працоуныя заслугі, жыццёвыя дасягненні? Паверце, і яны у Ніны Паулауны ёсць, іх у яе можа не менш, чым у многіх з нас. Але пра гэта калі-небудзь пасля. Сёння ж мне хацелася сказаць толькі пра чалавечую дабрату. Асабліва прыемна гэта рабіць у дачыненні да жанчыны. І двойчы — напярэдадні 8 Сакавіка.

**В. РАГОЙША,**
**в. а. дацэнта кафедры беларускай літаратуры.**

*Паспяхова працуюць на кафедры агульнай хіміі нядауня выпускніцы аспірантуры Раіса Іванауна Козлік і Ганна Іванауна Абражэвіч (здымак унізе).*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



# ЧАРАЎНІЦЫ-ХІМІКІ

Хімічны факультэт з поунай падставай можна назваць жаночым. Сярод студэнтау — большасць дзяучат. Сярод выкладчыкау таксама многа жанчын. А калі гаварыць пра абслугоуваючы персанал, то тут жанчыны у пераважнай большасці.

Акрамя непасрэднай падрыхтоукі высокакваліфікаваных спецыялістау, жанчыны-выкладчыкі вядуць вялікую выхаваучую работу. Уклад іх у грамадскую працу даволі значны. Выдатны педагог і лектар дацэнт кафедры неарганічнай хіміі Галіна Антонауна Папковіч шэфствуе над факультэцкай акадэмічнай камісіяй. Ганна Раманауна Улазава і Галіна Ігнацьеуна Васільева, дацэнты кафедры неарганічнай хіміі, з'яуляюцца членамі метадычнай камісіі кафедры. Яны сааутары многіх дапаможнікау і задачнікау, якія знайшлі усеагульнае прызнанне. Аднак загружанасць вучэбнай работай не адрывае іх ад грамадскіх спрау. Галіна Ігнацьеуна Васільева, напрыклад, неаднаразова выбіралася у партыйнае і прафсаюзнае бюро, а Ганна Раманауна Улазава актыуна удзельнічае у палітыка-выхаваучай рабоце сярод студэнтау.

Дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі Валерыя Рыгорауна Шлык — цудоуны выкладчык і чалавек вялікай душы. Яна выбіралася сакратаром партыйнага бюро факультэта і цяпер вядзе шырокую грамадскую работу, з'яуляецца сакратаром савета хімічнага факультэта.

Галіна Андрэеуна Лазерка, дацэнт кафедры фізічнай хіміі—аутарытэтны і кваліфікаваны педагог. Яе лекцыі па фізічнай хіміі успрымаюцца з вялікім інтарэсам. У калектыве паважаюць Галіну Андрэеуну як чалавека з цудоунымі душэунымі якасцямі. Яна добры і чулы таварыш.

У гэтым пераканаліся нашы студэнты, якія ездзілі у 1969 годзе на практыку у Іену (ГДР). Галіна Андрэеуна была кірауніком гэтай групы студэнтау.

Людміла Васільеуна Шубіна, кандыдат хімічных навук, старшы выкладчык кафедры арганічнай хіміі — намеснік сакратара партбюро па арганізацыйнай рабоце. На яе плечы ускладзена сапрауды мужчынская нагрузка, але яна вельмі добрасумленна і эфектыуна з ёй спрауляецца. Акрамя таго, яна чытае адзін з асноуных курсау хімічнага факультэта — арганічную хімію.

Жанчыны-хімікі зарэкамендавалі сябе як выдатныя вучоныя. Вольга Раманауна Скараход, дацэнт кафедры аналітычнай хіміі—аутар многіх цікавых і каштоуных публікацый. Пад яе кірауніцтвам зроблена і абаронена некалькі дысертацыйных работ. Кандыдат хімічных навук, асістэнт кафедры неарганічнай хіміі Неаніла Іосіфауна Кунцэвіч — выдатны спецыяліст па радыяцыйнай хіміі.

Нашы дзяучаты, якія складаюць каля 70 працэнтау студэнцкага калектыву, не уступаюць хлопцам у якасці ведау. Ларыса Сцяпанава, студэнтка 5-га курса, здала амаль усе экзамены за універсітэцкі курс на выдатна. Цяпер яна выконвае дыпломную работу на кафедры неарганічнай хіміі. Ужо у час вытворчай практыкі на заводзе яна паказала сябе добрым спецыялістам.

Добрых вынікау у зімовую экзаменацыйную сесію дабіліся студэнткі чацвёртага курса Н. Самахвалава, Е. Абросімава, Т. Усціменка і С. Некрашэвіч.

Прыемна было пачуць ад экзаменатарау аб трывалых ведах студэнтак 3-га курса Т. Наумчык, Г. Лойка, Е. Рагоцкай. А трэці ж курс адзін з самых напружаных, самых цяжкіх!

З задавальненнем можна назваць імёны другакурсніц В. Бадзеевай, О. Альшэускай, Г. Калевіч, якія здалі зімовую сесію на выдатна.

Дзяучаты факультэта цудоуныя актывісты. Усіх захапляе сваім задорам трэцякурсніца Н. Трызна. Многа дзяучат у камсамольскіх бюро курсау. Яны па праву лідзіруюць ва усёй грамадскай рабоце. Многія актыуна удзельнічаюць у СНТ. Іх работы атрымліваюць высокія адзнакі на аглядах.

Нельга не сказаць некалькі слоу пра дзяучат-аспірантак. Таццяна Гаеуская, аспірантка другога года навучання, выконвае вельмі важную работу, якая мае вялікае народнагаспадарчае значэнне. Тамара Пушкарова у гэтым годзе заканчвае аспірантуру. Яна з'яуляецца сааутарам некалькіх арыгінальных публікацый па фотахіміі. Гэта — таленавіты спецыяліст, які дасканала валодае многімі сучаснымі метадамі даследаванняу, удумлівы тэарэтык і выдатны эксперыментатар. І што вельмі каштоуна — Тамара вясёлы і жыццярадасны чалавек. Калектыу, у якім давядзецца працаваць Тамары пасля заканчэння аспірантуры, знойдзе у яе асобе выдатнага таварыша і спецыяліста.

На хімічным факультэце выконваецца некалькі гаспадарча-дагаворных работ, і тут удзел жанчын адчувальны. Яны працуюць інжынерамі і тэхнікамі. І водгукі аб іх рабоце найлепшыя. Марына Юр'еуна Навасёлава і Гвідона Пятроуна Шаучэнка добра зразумелі пастауленыя перад імі задачы і атрымліваюць навуковыя вынікі высокай якасці.

Кожны дзень хімікі прыходзяць у чыста прыбраны, светлы хімічны корпус. З 5 гадзін раніцы у ім ужо працуюць прэпаратары і прыбіральшчыцы Н. А. Данілава, Н. І. Слаук, М. І. Сцефановіч і іншыя. Чыста вымыта падлога, зіхаціць пасуда — незауважальная, але вельмі патрэбная праца, без якой нельга абысціся.

А колькі цёплых слоу можна сказаць у адрас нашых лабарантау, якія абслугоуваюць вучэбны працэс. Уявіце сабе, што з-за адной якой-небудзь дробязі могуць сарвацца шасцігадзінныя лабараторныя заняткі. Але такое яшчэ ні разу не здарылася. І у гэтым заслуга Ганны Сямёнауны Гайдаевай, Валі Багданавай, Тоні Міхальчук, Жаны Сарока, Ганны Міхайлауны Харужык, Вольгі Платонауны Рускевіч і многіх, многіх іншых.

Дакладна, строга па раскладу працякае вучэбны працэс на факультэце. Шмат сіл гэтаму аддаюць дыспетчары Ларыса Сяргееуна Германовіч, Любоу Аляксееуна Грынчык, сакратар дэканата Ніна Сцяпанауна Антонава.

Цудоуныя жанчыны працуюць і вучацца на хімфаку. Гэта людзі, якія не шкадуюць сіл для дасягнення вялікай усенароднай мэты — камунізма.



**М. ГІЛЕВІЧ,**
**сакратар партыйнага бюро хімфака, дацэнт.**

